УДК [61+615.1](06)(043.2)
ББК 5+52.81
А 43
ISBN 978-985-21-1569-8



***Гопта К. А.***

**ВАСІЛЁК І ЯГО ЛЕКАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ**

***Навуковы кіраўнік выкладчык Качан А. С.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Васілёк сіні ці валошка (народныя назвы гэтай палявой расліны – валынка, сіноўнік, сінька, казэлец, раднянка, хабэрка, гарандлянка) сімвалізуе Радзіму і лепшыя якасці беларусаў – душэўнасць, гасціннасць, сціпласць, прыязнасць і надзейнасць. Гэтую кветку можна ўбачыць на нацыянальным арнаменце. Васілёк увасабляе сабой мірнае неба над галавой, сінь беларускіх азёр, глыбіню вачэй беларусаў. Акрамя вышэйпералічаных сімвалічных вобразаў народ верыць у гаючую моц гэтай расліны.

Лячэбныя ўласцівасці васілька дазваляюць шырока прымяняць яго ў медыцыне і касметалогіі. У якасці лекаў выкарыстоўваюць толькі сінія краявыя кветкі, якія пры высыханні павінны быць ярка-сіняга колеру. Лічыцца, што яны ўтрымліваюць гліказіды, цытуарын, флаваноіды, вітаміны, дубільныя рэчывы, мінеральныя солі, алкалоіды, арганічныя кіслоты і іншыя рэчывы, якія станоўча ўплываюць на арганізм чалавека. Прэпараты з кветак васілька (гарбата, настой, адвар) выкарыстоўваюць як стымулюючы апетыт, танізавальны, супрацьзапаленчы і антымікробны сродак. Высакаякасны васількові мёд, дзякуючы яго саставу, спрыяе падтрымцы імунітэту і заслужана называецца прыродным антыбіётыкам.

У навуковай медыцыне васілёк выкарыстоўваецца ў мачагонных зборах, асабліва пры ацёках ныручнага і сардэчнага паходжання, а таксама як супрацьспазматычны сродак пры хваробах печані. Кветкі ў выглядзе настою і экстрактаў прымяняюцца пры нефрытах, цыстытах, урэтрытах і пры захворваннях печані і жоўцевых шляхоў як жаўцягоннае.

У народнай медыцыне адвары кветак васілька ўжываюць пры ацёку сэрца, бранхіце, коклюшы, як гарачкапаніжальнае пры прастудзе. Жаўтуха, глісты, ліхаманка, колікі, падагра – яшчэ адзін спіс хвароб, ад якіх можна пазбавіцца з дапамогай лекаў, дзе галоўным кампанентам з'яўляецца васілёк. Гэта расліна прымяняецца пры галаўных болях, ачышчэнні крыві. У выглядзе прымочак і кампрэсаў – для лячэння кан'юктывітаў (запалення слізістай абалонкі павекаў), павышанай стамляльнасці вачэй, слёзацёку, кураслепе. Прымочкі з адварам выкарыстоўваюць для гаення ран пры фурункулёзе, экзэме, трафічных язвах. Адвар кветак з'яўляецца сродкам, які паляпшае стравaванне, дапамагае пры дыярэі ў дзяцей, матачных крывацёках, нервовых і страўнікавых захворваннях.

Лекавае значэнне мае васілёк і ў касметалогіі. Настойка васілька дапамагае пры высыпаннях. Парашком здробленага насення лечаць вадзянкі, барадаўкі. Пры тлустай скуры выкарыстоўваюць марлевыя кампрэсы.

Кветкі васількоў можна сустрэць ў якасці інгрэдыентаў у некаторых чайных зборах і травяных гарбатах. У кулінарыі іх дадаюць у першыя і другія стравы, соусы і падліўкі. Парашок з сухіх кветак – выдатная заправа для супоў, баршчоў, мясных і рыбных страў.

Трэба звярнуць ўвагу на тое, што васілёк мае актыўныя спалучэнні, у склад якіх уваходзяць цыянавыя кампаненты, таму прэпараты з кветак гэтай расліны трэба ўжываць пасля атрымання кансультацыі ў доктара.